*Эмануіл Іофе, доктар гістарычных навук, акадэмік Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцяў, прафесар БДПУ імя М.Танка*

# Якуб Колас — этнограф і гісторык

## Да 115-годдзя з дня нараджэння

Жыццё і дзейнасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа сталі прадметам даследавання ў многіх кнігах, брашурах, артыкулах. Значна больш вывучаны яго дзейнасць як паэта і празаіка, летапіс яго жыцця і творчасці, менш — дзейнасць Я.Коласа як вучонага і выкладчыка сярэдняй спецыяльнай і сярэдняй школы. У ліку маладаследаваных — яго праца і ў Інстытуце беларускай культуры і БДУ.

Адзін з першых беларускіх акадэмікаў, Я.Колас увайшоў у гісторыю навукі БССР не толькі таму, што каля 27 гадоў працаваў віцэ-прэзідэнтам АН БССР, а перш за ўсё як таленавіты этнограф, лінгвіст, фальклырыст і гісторык.

Можна смела сказаць, што юнак пачаў займацца навуковай дзейнасцю ў сценах Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Але Кастусь Міцкевіч, мабыць, сам таго не ўсведамляў. Нельга не згадзіцца з даследчыцай Э.Р.Сабаленка, што, відаць, да 1900 г. адносіцца напісанне першага літаратурна-этнаграфічнага твора Я.Коласа "Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле".

Сярод этнаграфічных запісаў, зробленых Міцкевічам-семінарыстам, галоўная ўвага ўдзяляецца апісанню народных прымет, звестак па народнай медыцыне, павер'ях, замовах. Будучага пісьменніка вельмі цікавіў такі бок сялянскага жыцця, як народныя веды. На думку К.Міцкевіча, яны былі шматпластовымі.

Этнаграфічная праца "О крестьянских постройках (деревни Люсина, Минской губернии, Пинского уезда, Хотыничской волости)" сведчыць аб значным навуковым росце Коласа-этнографа. Будучы паэт паказаў добрае знаёмства з тагачаснай этнаграфічнай літаратурай, з методыкай збірання этнаграфічных матэрыялаў. Аналіз працы "О крестьянских постройках..." дае падставу сцвярджаць, што перад намі ўдумлівае, сур'ёзнае даследаванне быту беларускага сялянства. Як адзначае Э.Р.Сабаленка, яно не страціла сваёй навуковай каштоўнасці і ў наш час. Па-першае, пісьменнік выявіў тут глыбокае веданне пытання, даючы падрабязныя, дэталёвыя апісанні сялянскага двара, хаты, гаспадарчых пабудоў, характарызуючы будаўнічую тэхніку, канструкцыю асобных дэталяў. Па-другое, цікавай яе робіць тое, што яна напісана на канкрэтным матэрыяле адной палескай вёскі. А пры той разнастайнасці будынкаў, якая была характэрнай для Палесся і іх размяшчэння, такая праца з'яўляецца вельмі патрэбнай для стварэння агульнага малюнка народнага палескага жылля [1, *64*].

Цікавасць да этнаграфіі Я.Колас пранёс праз усё жыццё. Так, у савецкі час ён цікавіўся жыллём беларускага селяніна. Аб гэтым сведчыць аналіз артыкулаў пісьменніка "Паездка на Агінбул", "Вялікія грандыёзныя задачы", "Трыццаць савецкіх год", яго прамова на XXII з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі.

Найбольшую яго ўвагу прыцягвалі менавіта тыя з'явы, якія сведчылі аб нараджэнні новага, савецкага быту. У лістападзе 1927 г. у газеце "Савецкая Беларусь" было апублікавана прывітанне Я.Коласа з нагоды яе двухтысячнага нумара. У гэтым прывітанні пясняр пісаў: "Савецкая Беларусь" павінна больш увагі і месца ўдзяляць на сваіх старонках вясковаму жыццю. Трэба, каб у газеце адбіваліся тыя змены, якія ўнесла рэвалюцыя ў жыццё і будаўніцтва савецкай вёскі. "Савецкая Беларусь" і зараз асвятляе сялянскі быт, але ў большасці ў выглядзе фактаў. Трэба на фоне гэтых фактаў даць поўны малюнак новай вёскі".

Я.Колас горача падтрымліваў і прапагандаваў усё новае, сучаснае, што з'яўлялася ў савецкай вёсцы, і змагаўся за набліжэнне таго часу, калі зусім знікне драўляная хата з саламянай страхой і на змену ёй прыйдуць прыгожыя катэджы ("Вусце").

У артыкуле "Трыццаць савецкіх год" народны паэт Беларусі падкрэсліваў: "Дый немагчыма цяпер драўляная скасабочаная хата з ускудлачанай саламянай страхою сярод прастораў калгасных палёў, не жытло яна для сённяшняга беларуса, які замацаваў у сваім ужытку і электрычную лямпу, і прыёмнік Мінскага радыёзавода, і свежую рэспубліканскую газету".

Я.Колас заўсёды жыва цікавіўся народным бытам беларусаў, іх штодзённым жыццём і святамі. Дэталёвы аналіз мастацкіх твораў пісьменніка дае ўсе падставы да вываду, што этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя ім, умела выкарыстаны ў гэтых творах, прычым там яны набылі больш глыбокае сацыяльнае гучанне.

Этнаграфічная спадчына пісьменніка — значны ўклад у навуку. На наш погляд, правамерна заключэнне, да якога прыйшла Э.Р.Сабаленка: "Некаторыя бытавыя з'явы, апісаныя пісьменнікам, асталіся неасветленымі ў этнаграфічнай літаратуры; другія, нават заўважаныя даследчыкамі народнага быту, у Коласа падаюцца больш шырока, каларытна, ярка. Нават па тых пытаннях, якім этнографы прысвяцілі цэлыя тамы (матэрыяльная культура, абрады і інш.), у коласаўскіх творах можна знайсці багата цікавага" [2, *114*].

Хацелася б закрануць яшчэ адзін бок навуковай дзейнасці. Справа ў тым, што выдатны беларускі паэт і празаік быў яшчэ і таленавітым вучоным-гісторыкам. І хоць гэту тэму закраналі аўтар гэтых радкоў [3] і даследчык В.Вабішчэвіч [4], яна, па сутнасці, засталася недаследаванай.

Нягледзячы на тое што цікавасць да гісторыі беларускага народа, дакладней, да гісторыі роднага краю ў Кастуся Міцкевіча праявілася яшчэ ў дзяцінстве і юнацтве, навуковая дзейнасць пісьменніка на гістарычнай ніве пачалася пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Родныя вялікага песняра, людзі, што сустракаліся з ім, сведчаць, што ён вывучаў многія гістарычныя крыніцы, быў знаёмы з навуковымі працамі Я.Ф.Карскага, У.І.Пічэты, У.М.Перцава і іншых вучоных па праблемах гісторыі і этнаграфіі.

У 30-ыя гг. Я.Колас зацікавіўся гісторыяй народных паўстанняў на Беларусі ў эпоху феадалізму. У артыкуле "У Новым годзе" ён пісаў: "...Апроч работы над паэмаю (гаворка ідзе аб паэме "На шляхах волі". — **Э.І.**), я мяркую паспрабаваць напісаць кінасцэнарый на гістарычным беларускім матэрыяле з часоў сялянскіх паўстанняў і казацкіх войн на Беларусі..." [5].

У сярэдзіне 30-ых гг. у народнага песняра ўзнікла думка аб напісанні твора аб Крычаўскім паўстанні, дзе на фоне гістарычнай абстаноўкі правесці ідэю барацьбы народных мас за сваё сацыяльнае вызваленне. У пісьме С.М.Гарадзецкаму Я.Колас адзначаў: "Я падбіраю матэрыялы для новай п'есы. Вялікі, ахапляючы матэрыял. Але яго мне мала. Сюжэт, дакладней, не сюжэт, а гістарычная аснова: Крычаўскае староства (у былой Магілёўскай губерні на Сожы), польскі кароль дараваў яго магнату князю Радзівілу. Багаты яўрэй Гдалій бярэ Крычаў на водкуп. Жорсткая сістэма выбівання падаткаў, пошлін з насельніцтва выклікае ропат, незадаволенасць сярод беларускай шляхты і дробнага памеснага дваранства і духавенства. Гдалію супрацьстаіць беларус-купец з сялян. Ён гандлюе войскам. Вядзе прапаганду супраць Гдалія. Узнімае паўстанне. Паўстанне цягнецца тры гады. Потым жорсткая расправа з паўстаўшымі. Абстаноўка — жудасная беднасць, разарэнне сялянства, запушчаныя палі і лясы, выюць воўкі" [6, *141*].

У 1938 г. Я.Колас прызнаўся: "...Але ўжо даўно займае мяне думка аб напісанні твора на гістарычным матэрыяле Беларусі. Маю ўвагу запыняе паўстанне ў Крычаве ў 1740—1743 гг., у якое было ўцягнута шмат людзей і якое каштавала працоўным шмат ахвяр. Крычаўскае староства тады належала князю Радзівілу, як падараванае яму польскім каралём. Купец Крычаўскага староства Гдалій бярэ Крычаў на водкуп.


2 Зак. 2046

Каб выбіць больш прыбытку, ён заводзіць цэлую сістэму налогаў і падаткаў, шырока выкарыстоўвае гандаль гарэлкай, спайвае беднату і закабальвае яе. Ён падрэзвае даходы папоў, становіцца канкурэнтам беларускіх купцоў і дробнай шляхты і выклікае нянавісць шырокага кола людзей. На чале руху супраць Гдалія становіцца яго канкурэнт — хоцімскі купец, беларус Васіль Вашчыла. Пачынаецца барацьба, у якую ўцягваюцца духавенства, дваранства, мяшчане, а потым і сяляне, войска і г.д.

Перад аўтарам стаіць удзячная задача — на фоне гэтай гістарычнай абстаноўкі правесці ідэю барацьбы прыгнечанага працоўнага народа за сваё сацыяльнае вызваленне" [7].

Аналіз гэтых радкоў Я.Коласа дае падставы меркаваць, што ён быў добра знаёмы з работамі беларускага савецкага гісторыка В.К.Шчарбакова "Нарыс гісторыі Беларусі. Ч. I" (Мінск, 1934), "Класавая барацьба і гістарычная навука Беларусі" (Мінск, 1934), "Паўстанне сялянства ў Крычаўскім старостве" [8], "Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізма" (Мінск, 1935), дзе даследуецца Крычаўскае паўстанне 1740—1744 гг.

У гэтыя ж 30-ыя гг. народнага песняра зацікавіла тэма Грунвальдскай бітвы. У пісьме С.М.Гарадзецкаму ад 25 лістапада 1938 г. ён пісаў: "...адбыўся ў 1410 годзе Грунвальдскі бой, дзе тэўтонцы былі разгромлены палкамі смаленскіх, беларускіх, рускіх і татарскіх войск. Аб гэтым маюцца багатыя гістарычныя матэрыялы і дакументы. Гэта тэма мне вельмі спадабалася..." [9, *177*].

Асабліва глыбока вывучэннем гісторыі на Беларусі Я.Колас заняўся ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі ён жыў у Ташкенце. 29 лістапада — 1 снежня 1943 г. Колас прымае ўдзел у рабоце сесіі АН БССР. На першым паседжанні ён выступіў з дакладам "Векавая дружба беларускага і рускага народаў і іх сумесная барацьба супраць нямецкай агрэсіі" [10].

Праз некаторы час 26 снежня 1942 г. у пісьме І.Ф.Клімаву Я.Колас адзначаў: "...Была ў нас сесія Акадэміі, з Масквы намякнулі, што было б нядрэнна, каб я выступіў на гістарычную тэму. Мая тэма была — векавая дружба беларускага і рускага



народаў і іх сумесная барацьба. Памог У.І.Пічэта, узброіў гістарычнымі фактамі. Але ж факты трэба было ўціснуць у нейкую логічную сістэму, даць ім кірунак, сагрэць іх чалавечым пачуццём і ажывіць жывым духам. Словам, павінен быў быць час, каб усё гэта зрабіць" [11, *341—342*].

Я.Колас працягваў распрацоўваць гэту тэму. У шостым нумары часопіса "Славяне" за 1943 г. быў надрукаваны яго артыкул "Сумесная барацьба рускага і беларускага народаў супраць нямецкай агрэсіі". У гэтай працы Колас адзначае, што ў гісторыі беларускага і рускага народаў значнае месца займае іх сумесная барацьба з нямецкімі агрэсарамі, што на працягу рада стагоддзяў беларускі народ пры падтрымцы рускага народа стойка абараняў сваю зямлю, сваю волю і сваю нацыянальную незалежнасць ад нямецкіх драпежнікаў.

Аналізуючы ход нямецкай агрэсіі супраць беларускага і рускага народаў, Я.Колас дзеліць гэтую агрэсію на некалькі этапаў.

Указваючы на разгром нямецкіх псоў-рыцараў на Чудскім возеры ў 1242 г., ён заключае, што так закончылася першая хваля нямецкай агрэсіі супраць беларускіх і рускіх зямель. Нямецкія рыцары аказаліся не ў сілах пераадолець мужнае супраціўленне рускіх і беларускіх народаў, дружна выступіўшых на абарону сваёй роднай зямлі, сваёй культуры і нацыянальнай незалежнасці [12, *33*].

На думку Я.Коласа, у другой палове XIV ст. нямецкія захопнікі, апамятаўшыся ад першых удараў, сабраўшы свежыя сілы, пачалі шалёны націск на Усход. Гэта другая хваля нямецкай агрэсіі закончылася Грунвальдскай бітвай, калі адборнаму ордэнскаму войску быў нанесены ўдар такой сілы, што ордэн перастаў быць небяспечным агрэсарам, які пагражаў славянскім і літоўскім народам.

Трэцяя хваля — 1918 г. Я.Колас падкрэслівае, што барацьба беларускага народа супраць нямецкай акупацыі затрымала наступленне германскіх войск на краіну Саветаў. Сумесная барацьба беларускага народа і маладой Чырвонай Арміі суп-

Каб выбіць больш прыбытку, ён заводзіць цэлую сістэму налогаў і падаткаў, шырока выкарыстоўвае гандаль гарэлкай, спойвае беднату і закабальвае яе. Ён падрэзвае даходы папоў, становіцца канкурэнтам беларускіх купцоў і дробнай шляхты і выклікае нянавісць шырокага кола людзей. На чале руху супраць Гдалія становіцца яго канкурэнт — хоцімскі купец, беларус Васіль Вашчыла. Пачынаецца барацьба, у якую ўцягваюцца духавенства, дваранства, мяшчане, а потым і сяляне, войска і г.д.

Перад аўтарам стаіць удзячная задача — на фоне гэтай гістарычнай абстаноўкі правесці ідэю барацьбы прыгнечанага працоўнага народа за сваё сацыяльнае вызваленне" [7].

Аналіз гэтых радкоў Я.Коласа дае падставы меркаваць, што ён быў добра знаёмы з работамі беларускага савецкага гісторыка В.К.Шчарбакова "Нарыс гісторыі Беларусі. Ч. I" (Мінск, 1934), "Класавая барацьба і гістарычная навука Беларусі" (Мінск, 1934), "Паўстанне сялянства ў Крычаўскім старостве" [8], "Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізма" (Мінск, 1935), дзе даследуецца Крычаўскае паўстанне 1740—1744 гг.

У гэтыя ж 30-ыя гг. народнага песняра зацікавіла тэма Грунвальдскай бітвы. У пісьме С.М.Гарадзецкаму ад 25 лістапада 1938 г. ён пісаў: "...адбыўся ў 1410 годзе Грунвальдскі бой, дзе тэўтонцы былі разгромлены палкамі смаленскіх, беларускіх, рускіх і татарскіх войск. Аб гэтым маюцца багатыя гістарычныя матэрыялы і дакументы. Гэта тэма мне вельмі спадабалася..." [9, *177*].

Асабліва глыбока вывучэннем гісторыі на Беларусі Я.Колас заняўся ў час Вялікай Айчыннай вайны, калі ён жыў у Ташкенце. 29 лістапада — 1 снежня 1943 г. Колас прымае ўдзел у рабоце сесіі АН БССР. На першым паседжанні ён выступіў з дакладам "Векавая дружба беларускага і рускага народаў і іх сумесная барацьба супраць нямецкай агрэсіі" [10].

Праз некаторы час 26 снежня 1942 г. у пісьме І.Ф.Клімаву Я.Колас адзначаў: "...Была ў нас сесія Акадэміі, з Масквы намякнулі, што было б нядрэнна, каб я выступіў на гістарычную тэму. Мая тэма была — векавая дружба беларускага і рускага народаў і іх сумесная барацьба. Памог У.І.Пічэта, узброіў гістарычнымі фактамі. Але ж факты трэба было ўціснуць у пэўную лагічную сістэму, даць ім кірунак, сагрэць іх чалавечым пачуццём і ажывіць жывым духам. Словам, павінен быў быць час, каб усё гэта зрабіць" [11, *341—342*].

Я.Колас працягваў распрацоўваць гэту тэму. У шостым нумары часопіса "Славяне" за 1943 г. быў надрукаваны яго артыкул "Сумесная барацьба рускага і беларускага народаў супраць нямецкай агрэсіі". У гэтай працы Колас адзначае, што ў гісторыі беларускага і рускага народаў значнае месца займае іх сумесная барацьба з нямецкімі агрэсарамі, што на працягу рада стагоддзяў беларускі народ пры падтрымцы рускага народа стойка абараняў сваю зямлю, сваю волю і сваю нацыянальную незалежнасць ад нямецкіх драпежнікаў.

Аналізуючы ход нямецкай агрэсіі супраць беларускага і рускага народаў, Я.Колас дзеліць гэтую агрэсію на некалькі этапаў.

Указваючы на разгром нямецкіх псоў-рыцараў на Чудскім возеры ў 1242 г., ён заключае, што так закончылася першая хваля нямецкай агрэсіі супраць беларускіх і рускіх зямель. Нямецкія рыцары аказаліся не ў сілах пераадолець мужнае супраціўленне рускіх і беларускіх народаў, дружна выступіўшых на абарону сваёй роднай зямлі, сваёй культуры і нацыянальнай незалежнасці [12, *33*].

На думку Я.Коласа, у другой палове XIV ст. нямецкія захопнікі, ачамятаўшыся ад першых udaraў, сабраўшы свежыя сілы, пачалі шалёны націск на Усход. Гэта другая хваля нямецкай агрэсіі закончылася Грунвальдскай бітвай, калі адборнаму ордэнскаму войску быў нанесены ўдар такой сілы, што ордэн перастаў быць небяспечным агрэсарам, які пагражаў славянскім і літоўскім народам.

Трэцяя хваля — 1918 г. Я.Колас падкрэслівае, што барацьба беларускага народа супраць нямецкай акупацыі затрымала наступленне германскіх войск на краіну Саветаў. Сумесная барацьба беларускага народа і маладой Чырвонай Арміі суп-

раць агульнага ворага яшчэ раз прадэманстравала ваенна брацтва рускага і беларускага народаў.

Ёсць усе падставы меркаваць, што чацвёртай хваляй ня мецкай агрэсіі Я.Колас лічыць напад фашысцкай Германії н СССР у чэрвені 1941 г. Свой артыкул ён заканчвае наступным словамі: "Побач з беларусам, украінцам і рускім, брацкая су вязь і дружба якіх выпрабавана гадамі сумеснай барацьбы стаяць сёння грузін, таджык, армянін, узбек, літовец і латыш казах і кіргіз — усе прадстаўнікі шматнацыянальнай сям' савецкіх народаў. Новы Грунвальд, яшчэ больш жудасны, чым некалі, чакае фашысцкіх захопнікаў".

Я.Колас часта разважаў над гісторыяй беларускага наро да, над старонкамі яго гераічнай і трагічнай барацьбы за сацы яльнае і нацыянальнае вызваленне. Вынікам гэтых роздума быў артыкул народнага паэта "Дваццаць пяць", прысвечанн юбілею БССР і апублікаваны ў газеце "Правда".

І хоць гэтыя радкі былі напісаны амаль паўстагоддзя таму яны і сёння не страцілі сваёй актуальнасці. Перад намі роз дум вучонага-гісторыка аб гісторыі свайго народа "...Суровая але слаўная гісторыя беларускага народа. Гісторыя гэта — шматвяковая барацьба народа супраць сацыяльнай неспра вядлівасці, супраць прыгнятальнікаў, супраць чужаземных захопнікаў і занявольнікаў...

У шматвяковай барацьбе за сацыяльную справядлівасць, за нацыянальную незалежнасць і цэласнасць, за сваю культуру гар таваўся, як сталь, беларускі народ. З свайго асяроддзя ён высунуў цэлы рад барацьбітоў за народную справу: Гаркуша, Крывашапка Вашчыла, Каліноўскі і іншыя. Ён даў цэлую плеяду грамадскіх культурных дзеячоў, якімі мог бы ганарыцца кожны народ: Георгій Францішак Скарына, Васіль Цяпінскі, Багушэвіч, Янка Купала.

...Былі ў гісторыі беларускага народа моманты яго росквіту але былі і часы яго ўпадку... Ён жыў і змагаўся..." [13].

У тыя грозныя гады Я.Колас заклікаў навуковых працаўнікоў неадкладна заняцца глыбокім вывучэннем гісторы беларускага народа, зрабіць усё, каб народ ведаў сваю гісторыю

У сваёй прамове на трэцяй сесіі Акадэміі навук БССР, якая адбылася ў Маскве 20 студзеня 1944 г., ён падкрэсліў:

"Мы, навуковыя працаўнікі, інтэлігенцыя народа, павінны сягоння моцна запісаць у сваіх мыслях, як вялік наш нявыплачаны доўг перад народам. Беларускі народ не атрымаў яшчэ з нашых рук свае гісторыі, аповесці аб слаўнай многавяковай барацьбе за незалежнасць, за культуру, за сваю нацыянальнасць, за зямлю сваіх продкаў... Мы павінны напісаць гісторыю свайго народа, запоўніць тыя белыя плямы, якія да сягонняшняга дня чакаюць свайго даследчыка. Мы павінны паказаць народу яго барацьбітоў-герояў, каб на іх прыкладах вучылася і выхоўвалася маладое пакаленне. Мы павінны вярнуць народу яго сыноў, якія бытуюць у памяці не па сваіх пашпартах..." [14, *322*].

Наогул, Я.Колас лічыў, што пісьменнік павінен добра ведаць гісторыю свайго народа, нават калі ён не піша на гістарычныя тэмы. У артыкуле "За высокую ідэйнасць і мастацкую дасканаласць" ён адзначаў: "...Паўтараю, у дадзеным выпадку ад пісьменніка патрабуецца правільнае разуменне гістарычнай сітуацыі, веданне самой справы, аб якой ідзе размова, адчуванне духу часу, калі адбываліся падзеі, і цвёрдае усведамленне вымаганняў таго гістарычнага адрэзка часу, у якім распачынаецца творчая работа" [15].

У пасляваенны час народны паэт прыняў актыўны ўдзел у абмеркаванні многіх спрэчных пытанняў гісторыі БССР эпохі феадалізму і капіталізму. У пісьме С.М.Гарадзецкаму ад 2 чэрвеня 1948 г. Я.Колас паведамляў: "...Цэлы тыдзень засядалі на сесіі гуманітарных навук Акадэміі. Разбіралі спрэчныя пытанні ў вобласці гісторыі БССР і ў вобласці гісторыі беларускай літаратуры. Трэба было ўстанавіць правільны погляд на ацэнку ролі Скарыны ў вобласці культуры, на Францішка Багушэвіча, на Кастуся Каліноўскага... Зразумела, такія абмеркаванні патрэбны — яны значна дапамагаюць нашым навуковым працаўнікам на гэтых франтах" [16, *534*].

У той жа дзень у пісьме Я.С.Мазалькову Я.Колас пісаў: "...У нас няма трывала ўстаноўленага погляду на Скарыну, на Францішка

Багушэвіча, на Кастуся Каліноўскага. Няправільная ацэнка і трактоўка гэтых дзеячоў тармазіла нашу работу па напісанню падручнікаў па гісторыі і беларускай літаратуры" [16, *535—536*].

Да апошніх дзён свайго жыцця Я.Коласа хвалявала праблема падрыхтоўкі шматтомнай і навукова-папулярнай гісторыі Беларусі, высвятленне і глыбокае даследаванне многіх праблем гісторыі беларускага народа, вывучэнне новых архіўных матэрыялаў. У сваёй прадмове на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі ён адзначыў: "Без вывучэння мінулага і сучаснага мы не можам прадбачыць будучага. У той жа час мы амаль не дбаем пра тое, каб збіраць, захоўваць і вывучаць матэрыялы аб жыцці народа. Выйшаў у свет новы том матэрыялаў па гісторыі Беларусі. А дзе ж асноўная кніга па гісторыі? Чаму яна не выходзіць у свет?.. А здарыцца патрэба, даводзіцца карыстацца выданнямі унікальнымі, няпоўнымі, з аднабокім асвятленнем падзей і фактаў. І гэтыя выданні недаступныя масаваму чытачу, студэнту і настаўніку. Што ім рабіць? Як ім задаволіць сваю прагу да гераічнага мінулага народа, яго слаўных спраў сягоння?

У нашай гістарычнай навуцы ёсць шмат нявысветленых падзей, напрыклад, шматлікія сялянскія паўстанні ў Беларусі, скажам, пачынаючы з XVII ст. ...А хіба зачынены дзверы архіваў і бібліятэк, хіба мала яшчэ непаварушаных дакументаў? З гэтага боку тэматыка, якую распрацоўваюць нашы навуковыя інстытуты, падлягае самай суровай крытыцы" [17, *232—233*].

Аналіз творчай спадчыны Я.Коласа, успаміны шэрага вядомых беларускіх савецкіх гісторыкаў аб народным песняру сведчаць аб тым, што ў яго асобе наша навука ў 1956 г. страціла таленавітага вучонага-гісторыка. Ён быў знаёмы са многімі гістарычнымі крыніцамі, навуковымі працамі гісторыкаў. Колас не толькі добра ведаў гісторыю Беларусі, але і пачаў яе даследаваць.

Як вучоны і арганізатар навукі, Я.Колас адрозніваўся шырынёй навуковых інтарэсаў. Правадзейны член Інстытута беларускай культуры, акадэмік АН БССР Г.І.Гарэцкі, які добра ведаў

Я.Коласа, адзначаў: "Канстанціна Міхайлавіча цікавілі не толькі пытанні літаратуры і навуковай тэрміналогіі, у распрацоўцы якой ён прымаў актыўны ўдзел. Я.Колас стаяў ля калыскі беларускай савецкай навукі, быў больш як 28 год віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук (на самай справе каля 27 гадоў. — **Э.І.**).

Канстанцін Міхайлавіч асабліва падкрэсліваў неабходнасць усебаковага вывучэння прыроды Беларусі, у тым ліку геалогіі ў мэтах пошуку карысных выкапняў. Пры сустрэчах са мною часта закранаў пытанні меліярацыі Палесся, паляпшэння сельскай гаспадаркі Беларусі, геалагічных даследаванняў, развіцця беларускай савецкай навукі і інш..." [18, *201*].

1. *Сабаленка Э.Р.* Першыя этнаграфічныя працы Якуба Коласа // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1967. — № 1. — С. 84.

2. *Сабаленка Э.Р.* З крыніц народнага жыцця // У сэрцы народным. — Мінск, 1967. — С. 114.

3. *Іофе Э.Р.* Якуб Колас як вучоны // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1982. — № 3. — С. 31—33.

4. *Вабішчэвіч В.* Якуб Колас — гісторык // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1985. — № 3. — С. 31—32.

5. Звязда. — 1935. — 1 студзеня.

6. *Колас Я.* Збор твораў: У 14 т. — Т. 13. — С. 141.

7. *Колас Я.* Над чым мы працуем // Літаратура і мастацтва. — 1948. — 10 сакавіка.

8. Запіскі Беларускай Акадэміі навук, 1934. — Кн. 3.

9. *Колас Я.* Збор твораў: У 14 т. — Т. 13. — С. 177.

10. Правда Востока. — 1942. — 1, 3 декабря.

11. *Колас Я.* Збор твораў: У 14 т. — Т. 13. — С. 341—342.

12. Славяне. — 1943. — № 6. — С. 33.

13. Правда. — 1943. — 31 декабря.

14. *Колас Я.* Збор твораў. — Т. 11. — Мінск, 1976. — С. 332.

15. Літаратура і мастацтва. — 1949. — 18 чэрвеня.

16. *Колас Я.* Збор твораў. — Т. 13. — С. 534, 535—536.

17. *Колас Я.* Збор твораў. — Т. 12. — С. 232—233.

18. *Гарэцкі Г.* Пра Якуба Коласа // Успаміны пра Якуба Коласа. — Мінск, 1982. — С. 201.